# Марына Кудзеля: «Змагаемся за кожнага пацыента»




Фото Виталия Гиля, "МВ"

Бераставіцкая ЦРБ не першы раз у лідарах сярод удзельнікаў штогадовага абласнога конкурсу-агляду прафесійнага майстэрства сярод медыцынскіх устаноў Гродзеншчыны: па выніках працы за 2015 і 2018 гады раённая бальніца была адзначана дыпломамі другой ступені. Дыплом першай ступені атрымала Малабераставіцкая амбулаторыя ўрача агульнай практыкі. Кватарскі ФАП мае дыплом трэцяй ступені.

Карэспандэнты «МВ» пабывалі ў Бераставіцы, каб даведацца пра клопаты спецыялістаў медыцынскай установы і сакрэты іх прафесійных поспехаў.

Галоўны ўрач Бераставіцкай ЦРБ Марына Кудзеля — мясцовая. Нарадзілася непадалёк ад райцэнтра, у пасёлку Пагранічны. Скончыла школу і паступіла ў Гродзенскі медыцынскі інстытут. Пасля клінічнай ардынатуры яе накіравалі ўрачом-неўролагам у Бераставіцу. Загадвала неўралагічным аддзяленнем, была намеснікам галоўнага ўрача. Апошнія пяць гадоў узначальвае калектыў бальніцы.

Репозиторий




сельскагаспадарчы, а таму асноўны кантынгент пацыентаў — сельскія жыхары, — расказвае Марына Антонаўна. — Калектыў дружны, працаздольны. Разам змагаемся за кожнага пацыента. Імкнёмся зрабіць усё неабходнае, каб медыцынская дапамога была даступнай: выдаем талоны да ўрача ў першую палову дня, а калі неабходна, прымаем і без талонаў. Кожны тыдзень арганізоўваем выезд вузкіх спецыялістаў да вясковых пацыентаў.

Раз на паўгоддзе робім падваравыя абходы. Стварылі грамадскі савет для разгляду актуальных пытанняў арганізацыі даступнасці медыцынскай дапамогі насельніцтву раёна. Камп'ютарызавалі работу рэгістратуры, прыстасавалі да патрэб пацыентаў графік клініка-дыягнастычнай лабараторыі. У нас працуе шматканальная тэлефонная сувязь.

Усе ўрачы паліклінікі выпісваюць электронныя рэцэпты: пацыентам выдадзена ўжо больш як 50 % электронных карт (пры нарматыве 20 %). Паспяхова выкарыстоўваем іншыя электронныя сэрвісы: запіс на прыём да

Репозиторий ГрГМУ

ўрача, электронныя накіраванні на шпіталізацыю, кансультаванне спецыялістаў абласных медыцынскіх устаноў.

Калектыў не надта вялікі: 63 урачы і 156 чалавек сярэдняга медыцынскага персаналу. Сёлета прыйшлі 14 маладых спецыялістаў. Яны забяспечваюцца інтэрнатам. Для тых, хто гатовы тут працаваць пастаянна, будуецца жыллё. Укамплектаванасць урачэбных пасад — 96,3 %, сярэдніх медыцынскіх работнікаў — 94,2 %. Каэфіцыент сумяшчальніцтва ўрачоў — 1,03 %, сярэдняга медыцынскага персаналу — 1,07 %. Кваліфікацыйныя катэгорыі маюць 59,7 % урачоў і 81,93 % сярэдняга медыцынскага персаналу. Сярэднемесячная зарплата ўрачоў за студзень-ліпень бягучага года склала 1 184 рублі, сярэдняга медыцынскага персаналу — 685,8.

Раённая бальніца разлічана на 121 койку, паліклініка — на 250 наведванняў у змену. Працуе Эйсмантаўская бальніца сястрынскага догляду на 20 коек, а таксама 5 амбулаторый урача агульнай практыкі і 6 ФАПаў. Доля ўрачоў агульнай практыкі складае 100 %. Дарэчы, самы першы ўрач агульнай практыкі ў Беларусі яшчэ ў 1998 годзе — мой папярэднік Станіслаў Зігізмундавіч Сарасек. Накірунак быў вядомы, але ж трэба было і падвучыцца, і забяспечыць каманду ўрача агульнай практыкі неабходнымі інструментамі: атаскопамі, афтальмаскопамі і г. д.

Праводзім актыўную работу па ранняй дыягностыцы анкалагічных захворванняў. Працягваем скрынінгавыя даследаванні. За 6 месяцаў бягучага года на ранніх стадыях выяўлены 65% выпадкаў раку. Кантралюем вынікі правядзення дыспансерызацыі насельніцтва і г. д.

Репозиторий ГрГМУ



СЯМЕЙНЫ ПАДЫХОД

Намеснік галоўнага ўрача па ме- дыцынскай частцы Яніна Скрундзеўская ў медыцыне з 1985 года. Пэўны час працавала ў медустановах Магілёўшчыны. З 2000-га — у Бераставіцы, 18 гадоў на пасадзе начмеда.

—Мы любім наш гарадскі пасёлак, нашу бальніцу і пацыентаў, — гаворыць Яніна Янаўна. — І, канечне ж, сваю работу. У нас цудоўны калектыў. Побач — граніца. Трэба быць гатовым не прапусціць небяспечную інфекцыю, аказаць першую дапамоіу тым, хто трапіў у аварыю альбо каго прыхапіў у дарозе інфаркт...

Галоўная медсястра бальніцы Ала Турэйка ў медыцыне з 1984 года. У Бераставіцу трапіла пасля заканчэння Мінскага медвучэшішча № 2.

—Спачатку мяне размеркавалі ў пульманалагічнае аддзяленне сталічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі. А потым выйшла замуж за хлопца з Бераставіцы. У 1985 годзе пераехала сюды назаўжды. Працую больш як 35 гадоў, з якіх 16 на пасадзе старшай медсястры тэрапеўтычнага адцзялення. З 2009-га — на пасадзе галоўнай медсястры. Пад маім патранажам 159

Репозиторий ГрГМУ

чалавек. Калектыў наш — вялікая сям'я, а таму да ўсяго сямейны падыход, — усміхаецца субяседніца.

У гэтым пераканаліся і карэспандэнты «МВ», калі бліжэй пазнаёміліся з бераставіцкімі медыкамі.

Урач аіульнай практыкі Ала Чарняўская таксама тутэйшая. Пасля ГрДМУ працуе ў Бераставіцы ўсяго другі год, але паспела набыць аўтарытэт сярод землякоў.

—Ала Сяргееўна прыехала да нас па мэтавым накіраванні, — распавядае Марына Кудзеля. — Яе любяць і пацыенты, і калегі. Маем надзею, што застанецца ў нас надоўга.

Урач-акушэр-гінеколаг Зоя Шуціла скончыла ГрДМУ, ардынатуру праходзіла ў медсанчасці «Хімвалакно» ў Магілёве. З мужам, урачом- тэрапеўтам, былі размеркаваны ў Краснапольскую ЦРБ. Праз паўтары гады вырашылі пераехаць на яе радзіму, у Бераставіцу. Цяпер муж Ігар Георгіевіч працуе ўрачом агульнай практыкі ў Малабераставіцкай амбулаторыі.

—Тут мы ўжо 29 гадоў, — гаворыць Зоя Леанідаўна. — За гэты час у нас з'явілася сваё радзільнае аддзяленне. З развіццём шматузроўневай перынатальнай сістэмы працаваць стала лягчэй. Новае абсталяванне — гістараскоп, кальпаскоп ды іншыя — дапамагае ў амбулаторных умовах назіраць за пацыенткамі. Стала прасцей лячыць паталогію шыйкі маткі — неабавязкова накіроўваць жанчыну ў перынатальны цэнтр. Кансультуем пацыентак разам са спецыялістамі абласного адцзялення «Шлюб і сям'я» альбо раімся ў час тэлекансультацыі. Кожны тыдзень праходзяць відэаканферэнцыі па перынаталогіі, дзе вырашаем пытанні праблемных цяжарных. Стала значна меней абортаў: цяжарнасць, як правіла, запланаваная. Ёсць псіхолаг, які праводзіць перадабортнае кансультаванне.

Пасля Слонімскага медвучылішча, якое скончыла ў 1975 годзе, шчыруе і акушэрка Наталля Сідарэнка. Першыя яе пацыенткі за гэты час не толькі нарадзілі сваіх дзяцей — многія ўнукаў дачакаліся.

Амаль 40 гадоў працуе ў бальніцы ўрач-інфекцыяніст Людміла Дзяшко, якая прыехала сюды ў 1983 годзе пасля заканчэння Барнаульскага медыцынскага ўніверсітэта па размеркаванні (муж вучыўся ў Гомельскім медінстытуце). Цяпер іх дынастыю працягвае сын Міхаіл.

Рэпазіторый ГрГМУ

МАЛАДЫЯ ГАДЫ, МАЛАДЫЯ ЖАДАННІ…




Ёсць што абмеркаваць маладым спецыялістам: сёлета ў Бераставіцу іх прыехала 14 чалавек.

У гэтым годзе ў Бераставіцую ЦРБ прыехалі 14 маладых спецыялістаў: 9 урачоў і 5 чалавек сярэдняга медыцынскага персаналу. Вольга Маркоўцава — урач-нарколаг. Нарадзілася ў прамысловым Жодзіна, што непадалёк ад Мінска, але ціхая Бераставіца ёй прыйшлася даспадобы:

— Тут вельмі камфортна, старэйшыя калегі добразычлівыя, заўсёды дапамагаюць.

Прадзед маладога ўрача-анестэзіёлага-рэаніматолага Івана Маркоўцава, які прыехаў сюды на працу, Аляксандр Міхайлавіч Рубінскі быў у свой час галоўным урачом бальніцы.

Бабуля — намеснікам галоўнага ўрача па медыцынскай частцы.

Тэрэса Лісавец пасля ВДМУ прыехала па размеркаванні ўрачом-афтальмолагам.

—Першыя ўражанні самыя прыемныя, — усміхаецца дзяўчына. — Была ўжо на прыёме, пацыентаў шмат, вельмі хацелася ўсім дапамагчы. Пачувалася ўпэўнена, бо старэйшыя калегі побач. Калі трэба, падкажуць, параяць. Гэта важна. Жывём у інтэрнаце. Сумаваць не даводзіцца.

Репозиторий ГрГМУ

...Восем гадоў працуюць у мясцовай бальніцы муж і жонка Міхалоўскія. Анатоль Анатольевіч — урач-стаматолаг, Марыя Генадзьеўна — урач-дэрматолаг-венеролаг. Пазнаёміліся ў студэнцкія гады, калі вучыліся ў БДМУ. Пабраліся шлюбам. Пасля заканчэння ВНУ вырашылі пераехаць са сталіцы ў Бераставіцу і ніколі не пашкадавалі аб гэтым. Працуюць, гадуюць дачушку. Ім давяраюць. Іх паважаюць.

—Я тут урач-універсал, — смяецца субяседніца. — Сітуацыі, якія ў раёне маюць дачыненне да дэрматалогіі і венералогіі, пад маім кантролем. А яшчэ я намеснік старшыні прафкама і старшыня раённай арганізацыі Беларускага саюза жанчын. Муж адказвае за стаматалагічнае здароўе пацыентаў. Пры гэтым разумеем: каб быць добрым прафесіяналам і не адстаць ад часу, трэба заўжды вучыцца. Удзельнічаем у профільных канферэнцыях і семінарах, конкурсах. Пастаянна займаемся самаадукацыяй. А яшчэ я аматар згуляць у шашкі. У раённых спаборніцтвах заняла першае месца, у абласных — чацвёртае. З задавальненнем падарожнічаем, любім інтэлектуальныя гульні.

Два гады працуе ў ЦРБ загадчык хірургічнага адцзялення Яўген Матусаў. Дапамагае яму аперацыйная медсястра — малады спецыяліст Майя Раманава.

— Нарадзіўся я ў Гродна,— расказвае пра сябе Яўген Матусаў. — Трапіў сюды па размеркаванні. Адпрацаваўшы два гады, вырашыў застацца. Мяркую, тут можна расці ў прафесійным плане: як правіла, у раённых бальніцах сустракаецца вельмі разнастайны спектр паталогій, даводзіцца часта працаваць у экстрэмальных умовах. Гэта каштоўны вопыт.

Репозиторий ГрГМУ





...На тэрыторыі Бераставіцкай ЦРБ засталіся рэшткі старадаўняга саду і ліпавая алея яшчэ з польскага часу. Кажуць, тут была дарога, па якой ішлі людзі да касцёла, каб памаліцца і папрасіць сабе і родным здароўя. Менавіта пра гэта дбаюць сёння і бераставіцкія медыкі.

Святлана Хорсун, «МВ». Фота Віталя Гіля, «МВ»

Репозиторий ГрГМУ